***Антонава Н. У.**, дактарант Акадэміі адукацыі кандыдат, педагагічных навук, дацэнт;*
***Галяш Г. А.**, настаўнік вышэйшай катэгорыі беларускай мовы і літаратуры ліцэя Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта*

# Беларуская мова. I клас

## (установы адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання)

### *Урокі 1–5*

#### Урок 1. Наша мова

**Мэта ўрока:** фарміраваць уменне ўважліва слухаць настаўніка, адрозніваць на слых рускае і беларускае маўленне, фіксаваць словы, гучанне якіх адрозніваецца ад рускай мовы (*приехал — прыехаў*) і прагаворваць іх за настаўнікам, знаёміць са словамі, не падобнымі да слоў рускай мовы (*мальчик — хлопчык*) і вучыць ужываць іх у маўленні; фарміраваць уменне запытвацца пра значэнне слова, калі яно незразумелае; вучыць адказваць на пытанне, карыстаючыся словамі самога пытання, пазнаёміць з лексікай на тэму «Ветлівыя словы», развіваць маўленчы слых, адвольную ўвагу; выхоўваць зацікаўленасць да вывучэння беларускай мовы.

**I. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў.**

Настаўнік рассаджвае вучняў вакол сябе (можна на дыване) і паведамляе ім аб тым, што ўрок сёння будзе незвычайны, таму што менавіта сёння вучні пачынаюць вывучаць беларускую мову. (Спачатку размову настаўнік вядзе на рускай мове.) Настаўнік пытаецца ў вучняў:

— Хто з вас чуў беларускую гаворку? Дзе і калі гэта было? Мабыць, хто ведае словы на беларускай мове, можа расказаць вершык ці праспяваць песеньку?

**II. Вывучэнне новай тэмы.**

Настаўнік прапануе вучням паслухаць і адказаць, на якой мове ён гаворыць. Настаўнік паведамляе на беларускай мове пра тое, што сёння на ўроку вучні пачынаюць вывучаць беларускую мову. Гэта родная мова беларусаў.

Потым прапануе адказаць па-беларуску, на якой мове прагучаў гэты тэкст.

— Якую мову мы пачынаем вывучаць?

**1. Знаёмства з вучэбным дапаможнікам.**

Настаўнік паведамляе, што вывучаць беларускую мову ім будзе дапамагаць падручнік (паказвае яго вучням, прапануе кожнаму ўзяць свой падручнік).

— Хто здагадаўся, як па-беларуску будзе «учебник»? Чаму ён так называецца?

Далей вучні разглядаюць вокладку падручніка, расказваюць, каго і што яны бачаць. Потым гартаюць падручнік і разглядаюць першы форзац, расказваюць, што на ім бачаць. Далей вучні знаёмяцца з умоўнымі абазначэннямі.

Настаўнік прапануе паслухаць верш і адказаць на пытанні:

— Хто мы такія? Як называецца краіна, у якой мы жывём? Разгледзьце першы малюнак у падручніку. Раскажыце, каго вы на ім бачыце. Хто можа прачытаць, што напісана на дошцы?

Далей настаўнік прапануе вучням адгарнуць падручнік у самы канец і разгледзець другі форзац, адказаць на пытанні:

— Што намалявана на старонках? Як называецца наша краіна? Каго бачым у небе? На што падобны квяцісты луг?

**2. Выкананне задання 1 вучэбнага дапаможніка.**

— Разгледзьце першы малюнак. Раскажыце, каго вы бачыце. У што апранутыя дзеці? Як называюць хлопчыка? дзяўчынку? Хто прачытае, як называецца кніга? Якім яшчэ словам можна назваць кнігу? Хто запомніў, як называецца учебник па-беларуску?

**3. Фарміраванне ўменняў аўдзіравання (заданне 4 вучэбнага дапаможніка).**

**3.1. Падрыхтоўка да слухання тэксту.**

Прагнозные «чытанне» малюнкавага рада. Падрыхтоўчая гутарка перад успрыманнем на слых:

— Разгледзьце малюнак. Каго вы на ім бачыце? (Настаўнік называе дзейных асоб па-беларуску.) Тэкст называецца «Як Мікітка сукенку з'еў». Як завуць хлопчыка? Што такое па-беларуску сукенка? Ці можна яе з'есці? А цукерку? Хочаце даведацца, пра што размаўлялі бабуля з унукам? Слухайце ўважліва. Потым скажыце, ці сапраўды Мікітка з'еў сукенку.

**3.2. Успрыманне твора на слых.**

Слуханне апавядання, суаднясенне зместу з малюнкавым радам. Пры неабходнасці актуалізацыя ў час слухання.

***Як Мікітка сукенку з'еў***

Прыехаў Мікітка да бабулі Алены ў госці. Бабуля і пытае:

— А ты, Мікітка, не забыў беларускія словы, добра ведаеш іх?

— Не, не забыў, — упэўнена адказаў унук, запіхваючы ў рот цукерку. — Можаш праверыць, як я гавару.

— Тады так зробім, — ажывілася бабуля Алена. — Я буду вымаўляць словы па-руску, а ты —

пераказваць іх за мною па-беларуску. Перакладчыкам будзеш. Дамовіліся?

— Дамовіліся, — згадзіўся ўнук і заадно пацікавіўся: — А што робіць перакладчык? *(Адкажыце на пытанне.)*

— Зараз пабачыш сам, — яшчэ болей ажывілася бабуля і пачала падшукваць у памяці словы, якія можна было б задаць унуку. А Мікітка пасур'ёзнеў, нават цукерку за шчакою прытрымаў.

Бабуля ж пачала:

— Клюква.

— Журавіны. *(Пакажыце на малюнку ў падручніку.)*

— Лук.

— Цыбуля.

— Картошка.

— Бульба.

— Сахар.

— Цукар.

— Бумага.

— Папера.

— Аист.

— Бусел...

Гэтак перабралі дзясяткі са два слоў. Убачыўшы, што ўнуку ўсё даецца лёгка, бабуля Алена прапанавала:

— А цяпер давай наадварот зробім. Будзем словы перакладаць з беларускай мовы на рускую.

І ўжо на першым жа слове нечакана спатыкнуліся.

— Сукенка, — вымавіла бабуля Алена, з усмешкай зірнуўшы ў вочы ўнуку.

— Конфета, — хуценька пераклаў Мікітка і языком перакінуў «конфету» за другую шчаку.

— Авой! — прытворна здзівілася бабуля Алена. — Няўжо ты можаш з'есці... платье? Сукенка — па-руску «платье»!

— Не, бабуля, ты жартуеш, — пакрыўдзіўся Мікітка. — Я добра ведаю, што цукерка — гэта конфета.

— Дык я ж пра сукенку гаварыла, — аж крышку разгубілася бабуля Алена.

— А я пра цукерку, — соладка прыцмокнуў Мікітка.

Абое задаволена рассмяяліся. Асабліва радаваўся Мікітка: пабыў жа перакладчыкам. А што недачуў трошкі — з кім такога не бывае?

*Паводле М. Чарняўскага* [1]

**3.3. Праверка агульнага разумення зместу тэксту.**

— Якія словы пераблытаў Мікітка? Што ён з'еў? Разгледзьце малюнкі. Назавіце прадметы па-беларуску. Запытайцеся адзін у аднаго пра назвы гэтых прадметаў.

**4. Азнаямленне з лексічнай тэмай «Словы ветлівасці».**

**4.1. Уступная гутарка.**

— Калі вы сустракаецеся з сябрамі, прыходзіце ранкам у клас, бачыце сваю настаўніцу, аднакласнікаў, заўсёды карыстаецеся правіламі. Якімі правіламі?

**4.2. Выкананне задання 2 вучэбнага дапаможніка.**

— Разгледзьце першы малюнак. Якое правіла выконваюць хлопчыкі? У беларускай мове таксама ёсць словы ветлівасці. Калі вітаюцца, то па-беларуску кажуць: «Добры дзень!»

Вучні вымаўляюць хорам. Настаўнік просіць павітацца з ім. Вучні хорам кажуць: «Добры дзень, Наталля Анатольеўна!» Настаўнік просіць павітацца з суседам па парце.

— Разгледзьце другі малюнак, скажыце, якое правіла паводзін выконваюць дзеці.

Вучні адказваюць на рускай мове, што «мальчик говорит девочке спасибо». Настаўнік паведамляе, што па-беларуску кажуць «дзякуй або вялікі дзякуй».

— Разгледзьце трэці малюнак, скажыце, якое правіла паводзін выконвае хлопчык.

Вучні адказваюць на рускай мове, што «мальчик пропускает девочку и говорит "пожалуйста"». Настаўнік паведамляе, што па-беларуску кажуць «калі ласка».

Настаўнік выклікае вучня і вучаніцу, дзеці разыгрываюць сітуацыю, адлюстраваную на малюнку.

— Разгледзьце чацвёрты малюнак. Скажыце, якое правіла паводзін выконваюць дзеці.

Вучні адказваюць на рускай мове, што «дети уходят и говорят учительнице "до свидания"». Настаўнік паведамляе, што па-беларуску кажуць «да пабачэння». Настаўнік запытваецца:

— Што вы мне скажаце, калі будзеце ісці да дому?

Вучні адказваюць хорам: «Да пабачэння».

**5. Гульня «Перакладчыкі».**

— Давайце ўсе разам пагуляем у перакладчыкаў. Я буду называць вам словы па-руску, а вы — перакладаць на беларускую мову (настаўнік дапамагае вучням): *белорусский язык, русский язык, слова, учебник, кофета*.

— А цяпер я буду называць словы па-беларуску, а вы перакладайце на рускую мову: *перакладчык, размаўляюць, падручнік*.

**III. Вынік урока.**

— Якую мову вы пачалі вывучаць? Якія словы на беларускай мове запомнілі?

## Урок 2. Я і мая школа. Настаўніца і вучні

**Мэта ўрока:** фарміраваць навык правільнага вымаўлення гука [г]; пазнаёміць з лексікай на тэму «Настаўніца і вучні», прывучаць ужываць словы ў маўленні; фарміраваць уменне асэнсавана ўспрымаць тэкст на слых; вучыць адказваць на пытанне, карыстаючыся словамі самога пытання; фарміраваць уменні гаварэння (паўтараць за настаўнікам сказы, арыентуючыся на схемы, выказвацца па малюнках да твора); развіваць фанематычны слых, слыхавую памяць; выхоўваць культуру паводзін на ўроку.

**Абсталяванне:** дэманстрацыйны матэрыял «З Днём ведаў»; прадметныя малюнкі: цыбуля,

бульба, цукар, папера, бусел, сукенка, цукерка, падручнік.

**I. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў.**

Настаўнік пытаецца, якую мову дзеці пачалі вывучаць, просіць прыгадаць, якія выразы ветлівасці запомнілі, пра каго слухалі на мінулым уроку.

Настаўнік прапануе гульню, падобную на тую, у якую гулялі бабуля з унукам: настаўнік будзе называць словы, вучні — выбіраць на дошцы адпаведны малюнак. Калі малюнак выбраны правільна, вучні хорам паўтараюць слова:

| | | | |
|---|---|---|---|
| цыбуля | бульба | цукар | папера |
| бусел | сукенка | цукерка | падручнік |

**II. Вывучэнне новай тэмы.**

**1. Фарміраванне навыкаў вымаўлення гука [г].**

**1.1. Азнаямленне з вымаўленнем гука [г].**

Назіранне вучнямі за выразным вымаўленнем настаўнікам гука [г] ізалявана, вымаўленне вучнямі гука [г], вымаўленне складоў і слоў з гукам [г].

— Паслухайце, як я вымаўляю словы: *гара, горад, гітара*. Ці адрозніваецца вымаўленне гука [г] па-беларуску ад вымаўлення на рускай мове? *(Гук [г] вымаўляецца не так, як у рускай мове.)*

Вучні вымаўляюць гук [г] хорам некалькі разоў.

**1.2. Вымаўленне слоў хорам за настаўнікам.**

Га-га-га: гарох, газета, гайка, гарбуз, галка.

Го-го-го: голас, горад, горды, горны, голы.

Гу-гу-гу: гуз, гульня, гутарка, гумка, гусяня.

Настаўнік адказвае на пытанні вучняў пра незразумелыя словы.

**1.3. Выкананне задання 1 вучэбнага дапаможніка.**

— Разгледзьце малюнкі. Назавіце кожны прадмет на малюнку на рускай мове. Затым па-беларуску.

Вучні вымаўляюць кожнае слова па-беларуску, вызначаючы месца гука [г] у ім. Называюць словы, якія адпавядаюць прыведзенай у вучэбным дапаможніку схеме.

**2. Уступная гутарка (па дэманстрацыйным матэрыяле).**

— Давайце ўспомнім першае верасня (сентября). Чым вам запомніўся гэты дзень? (Адказы вучняў.) Паглядзіце на малюнак. Каго сустракае настаўніца? Што трымаюць у руках вучні? Паслухайце верш і скажыце, кім сталі дзеці.

Рана ў школу мы ідзём,
На світанку ўсталі.
Ранцы з кніжкамі нясём —
Школьнікамі сталі.

*М. Чарняўскі* [1]

Верш завучваецца на памяць.

**3. Выкананне задання 2 вучэбнага дапаможніка.**

— Разгледзьце першы малюнак. Раскажыце, куды хлопчык пайшоў з мамай і татам. Як вы здагадаліся? Чым адрозніваюцца схемы пад малюнкам? Скажыце пра тое, што хлопчык пайшоў у школу, па першай схеме. Скажыце гэта ж так, каб інфармацыя адпавядала другой схеме. Змяніце выказванне, каб яно адпавядала трэцяй схеме.

Аналагічная работа праводзіцца з фразай «Хлопчык стаў вучнем».

— Разгледзьце другі малюнак. Як назваць дзяцей, якія вучацца? Хто іх вучыць? Што было ў школе? Складзіце сказы адпаведна схемам. (Выкарыстанне лексікі: *настаўніца, вучань, вучаніца.*)

**4. Фарміраванне ўменняў аўдзіравання (заданне 4 вучэбнага дапаможніка).**

**4.1. Падрыхтоўка да слухання тэксту.**

— Разгледзьце ўважліва першы малюнак. Хто стаіць каля дошкі? Што разглядае на стале настаўніца? Як вы думаеце, пра што размаўляе настаўніца з вучнем? Чаму ў яе руках такая нязграбная, крывая ўказка? Слухайце ўважліва, каб даведацца, чаму настаўніца выбрала такую ўказку.

**4.2. Успрыманне твора на слых.**

Слуханне апавядання, суаднясенне зместу з малюнкавым радам. Пры неабходнасці актуалізацыя ў час слухання.

***Крывая ўказка***

Настаўніца Ніна Васільеўна на вялікай табліцы паказвала першакласнікам літары. Указкі ў яе не было, і яна карысталася алоўкам. Аловак быў кароткі, і некаторыя вучні не разумелі, якую літару паказвала настаўніца.

— Без указкі няёмка, — сказала настаўніца. — Вось каб мне хто-небудзь прынёс добрую палачку.

Назаўтра дзеці прынеслі дваццаць сем указак. Тут былі і лазовыя пруткі, і бамбукавыя трысцінкі, і акуратна выструганыя палачкі. Афарбаваныя ў розныя колеры, яны ляжалі на стале, быццам на выставе. Цікава, чыя ж указка больш за ўсё спадабаецца Ніне Васільеўне?

Настаўніца ўвайшла ў клас і ўсміхнулася. Потым яна ўзяла самую прыгожую палачку, пакруціла яе ў руках і спытала:

— Хто зрабіў гэтую ўказку?

На пярэдняй парце ўзняўся хлопчык.

— Гэтую ўказку зрабіў мой тата, — з гонарам адказаў ён.

Ніна Васільеўна злёгку паварушыла бровамі і адклала ўказку ўбок. Яна стала перабіраць усе ўказкі і задаваць адно і тое ж пытанне. Дзеці адказвалі, што ўказкі зрабілі то тата, то дзядзька, то мама, то старэйшы брат. Прыгожыя: сінія, чорныя, чырвоныя, жоўтыя ўказкі настаўніца адкладвала ўбок. Твар яе зрабіўся строгім.

Але вось Ніна Васільеўна ўзяла ў рукі нязграбна выструганую палачку.

— А хто зрабіў гэтую ўказку?

На другой парце ўзняўся Вася Лукашоў. Гэта быў чырванашчокі хлопчык з прыплюснутым носам і з вяснушкамі на шчоках. Яму было няёмка. Усе пазіралі на яго і пасмейваліся з яго крывенькай указкі.

— Гэтую палачку выстругаў я, — адказаў Вася і, яшчэ больш збянтэжыўшыся, апусціў галаву.

Ніна Васільеўна падышла да Васі.

— Твая ўказка не вельмі прыгожая, але затое ты зрабіў яе сам, — сказала яна, усміхаючыся.

Ніна Васільеўна ўзяла Васеву ўказку, падышла да дошкі і стала паказваць ёю новыя літары. У класе зрабілася ціха-ціха. Вучні час ад часу паглядвалі на Васю. З павагай, вядома!

*П. Карастылёў* [2]

**4.3. Праверка агульнага разумення зместу тэксту.**

— Аб чым настаўніца папрасіла вучняў? Як адклікнуліся вучні на просьбу настаўніцы? Чаму Ніна Васільеўна выбрала ўказку Васі?

**5. Выкананне задання 3 вучэбнага дапаможніка.**

Вучні паступова разглядваюць малюнкі пад кіраўніцтвам настаўніка. Па кожным малюнку вызначаюць, што на гэтым уроку робіць настаўнік, а што робяць вучні. Настаўнік дапамагае выказацца па-беларуску. Вучэбны прадмет называць не трэба.

Мал. 1: настаўнік вучыць чытаць, вучні чытаюць. Мал. 2: настаўнік паказвае, як пісаць, вучні пішуць. Мал. 3: настаўнік вучыць маляваць, а вучні малююць. Мал. 4: настаўнік паказвае рухі, вучні паўтараюць іх. Мал. 5: настаўнік вучыць гаварыць па-беларуску, а вучні паўтараюць за ім. Мал. 6: настаўнік вучыць лічыць, вучні лічаць. Мал. 7: настаўнік расказвае пра прыроду, а вучні слухаюць. Мал. 8: настаўнік паказвае, як выразаць, вучні выразаюць.

Потым настаўнік называе ці паказвае лічбу. Вучні выказваюцца па адпаведным малюнку на беларускай мове. Можна арганізаваць работу ў парах.

**III. Вынік урока.**

— З якім гукам пазнаёміліся на ўроку? Назавіце словы з гэтым гукам. Пра каго слухалі тэкст?

### Урок 3. Я і мая школа. Вучэбныя рэчы

**Мэта ўрока:** фарміраваць навык правільнага вымаўлення гука [ў], пазнаёміць з лексікай на тэму «Вучэбныя рэчы»; фарміраваць уменні асэнсавана ўспрымаць беларускую мову на слых (суадносіць пачутае з малюнкавым радам, адказваць на пытанні, вызначаць у тэксце новыя словы лексічнай тэмы); фарміраваць уменні гаварэння (правільна і дакладна называць прадметы, ужываць новыя словы пры адказе на пытанні, ужываць словы тэксту пры канструяванні сказаў па схеме, пераказе па малюнках); выхоўваць акуратнасць, ашчадныя адносіны да вучэбных рэчаў.

**Абсталяванне:** прадметныя малюнкі: гарох, груша, гарбуз, агрэст, агурок, вішня, морква, цыбуля; дэманстрацыйны матэрыял «На ўроку» карткі з літарамі ***Р***, ***Б***.

**I. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў.**

**1.1. Работа па дэманстрацыйным малюнку «На ўроку».**

Настаўнік просіць назваць па-беларуску тых, хто адлюстраваны на малюнках, і адказаць, што яны робяць.

**1.2. Гульня «Азбука саду і агарода».**

Вучні знаходзяць сярод прадметных малюнкаў выявы, у назвах якіх ёсць гук [г]:

| | | | |
|---|---|---|---|
| гарох | груша | гарбуз | агрэст |
| агурок | вішня | морква | цыбуля |

**II. Вывучэнне новай тэмы.**

**1. Фарміраванне навыкаў вымаўлення гука [ў].**

**1.1. Азнаямленне з вымаўленнем гука [ў].**

— Паслухайце, як я вымаўляю словы, і скажыце, які гук апошні: пісаў, заснуў, лічыў. (Беларускае слова «пісаў» параўноўваецца з рускім «писал».) Якое слова вам было незразумелае? *(Лічыў — считал.)* У беларускай мове ёсць гук [ў]. Ён вымаўляецца коратка. (Вучні за настаўнікам вымаўляюць ізаляваны гук [ў].)

**1.2. Выкананне задання 1 вучэбнага дапаможніка.**

Вучні называюць прадметы на малюнках па-руску. Настаўнік перакладае на беларускую мову. Вучні паўтараюць за ім. Вызначаецца месца гука [ў] па схеме слова. Вучні «прачытваюць» схему слова, выразна вымаўляючы гук [ў]. Настаўнік паказвае карткі з літарамі ***Р, Б*** вучні адпаведна вымаўляюць словы.

**1.4. Вылучэнне слоў з вывучаемым гукам.**

— Паслухайце скорагаворку. Пра каго яна?

Воўк вяроўку віў,
Воўк ад крыўды выў:
— Эх, была б вяроўка —
Не ўцякла б кароўка!

*М. Чарняўскі* [1]

— Што рабіў воўк? Чаму ён выў? Навошта яму вяроўка? Назавіце словы з гукам [ў]. Якія словы вам незразумелыя? А цяпер будзем вучыцца правільна вымаўляць словы з гукам [ў] у скорагаворцы. (Кожны радок вымаўляецца хорам.)

**2. Выкананне задання 2 вучэбнага дапаможніка.**

— Паслухайце верш. Куды збіраецца дзяўчынка?

Падручнікі, сшыткі
Купіла мне мама.
У школу з сябрамі
Пайду я таксама.

*П. Шыбут* [3]

— Якія прадметы спатрэбяцца ў школе? Гэтыя прадметы называюцца вучэбныя рэчы. Разгледзьце малюнак. Назавіце спачатку тыя, якія вы ўжо можаце назваць па-беларуску. Пра назвы астатніх запытайцеся ў мяне.

Пакажыце на малюнку і назавіце прадметы, якімі пішуць; якімі малююць; з дапамогай якога вучацца чытаць; у якім вучацца пісаць; у якім вучацца маляваць; у якім носяць вучэбныя рэчы...

Вучні будуюць выказванне «З сабой у школу я вазьму...».

**3. Выкананне задання 3 вучэбнага дапаможніка.**

Вучні з дапамогай настаўніка будуюць выказванне на тэму «Ці правільна складзены рукзак у школу?».

**4. Фарміраванне ўменняў аўдзіравання (заданне 4 вучэбнага дапаможніка).**

**4.1. Падрыхтоўка да слухання тэксту.**

— Разгледзьце малюнкі. Што здарылася? Дзе адбываюцца падзеі? Чым займаюцца дзеці? Паглядзіце на апошні малюнак. Які там хлопчык? Па-беларуску кажуць «пачырванеў». Паслухайце і скажыце, чаму пачырванеў Вадзік.

**4.2. Успрыманне твора на слых.**

***Чаму пачырванеў Вадзік?***

У класе ціха-ціха. У першакласнікаў урок малявання. Учора яны хадзілі з настаўніцай у лес, а сёння Ніна Пятроўна сказала, каб кожны намаляваў тое, што яму найбольш спадабалася ў лесе.

Вадзіку спадабаўся грыб мухамор. А Вадзікава суседка Верачка намалявала рабіну. Яна так захапілася работай, што нават высунула кончык языка. Але вось бяда: не паспела Верачка намаляваць і паловы, як раптам — трах! — зламаўся яе чырвоны аловак. *(Пакажыце чырвоны аловак.)*

— Вадзік, дай мне сваю тачылку, у мяне аловак **зламаўся**, — папрасіла Верачка свайго суседа.

— А дзе твая? — строга запытаў Вадзік.

— У мяне няма.

— Чаму ж ты мне пра гэта ўчора не сказала? Я б табе сваю старую тачылку прынёс. Яна крыху ступілася, але алoвак яшчэ затачыць можна. Заўтра я табе яе прынясу.

— Мне трэба зараз, а не **заўтра**, — пакрыўдзілася Верачка.

— А дзе ж я табе зараз яе вазьму? Яна ж у мяне дома засталася.

— Дык у цябе ж вунь новая тачылка ляжыць, — сказала Верачка.

— Э, не! — пакруціў галавой Вадзік. — Новую я табе не дам. Калі я пачну яе ўсім даваць, дык яна хутка ступіцца, — і ён **схаваў** тачылку ў пенал.

— Жмінда! — сказала Верачка і заплакала.

— Верачка, чаго ты плачаш? — запыталася настаўніца.

— Мой чырвоны аловак зламаўся... Чым жа я цяпер ягадкі намалюю на сваёй рабіне? — усхліпнула Верачка.

Настаўніца абвяла вачыма прыціхлы клас і запытала:

— Дзеці, хто можа даць Верачцы свой чырвоны алoвак? *(А вы далі б алoвак?)*

І не паспела яна сказаць гэта, як да Верачкі з усіх бакоў пацягнуліся рукі з **алоўкамі**. Кожны **хацеў** дапамагчы Верачцы. Толькі адзін Вадзік нібы нічога не чуў і не бачыў. Ён нізка **схіліўся** над сваім сшыткам, а вушы яго раптам зрабіліся чырвоныя-чырвоныя.

*Паводле Я. Бяганскай* [4]

Адказ на пытанні вучняў пра незразумелыя словы.

**4.3. Праверка агульнага разумення зместу тэксту.**

— Чаму пачырванеў Вадзік? Якая бяда здарылася ў Верачкі? Хто ёй дапамог? Раскажыце па малюнках, што адбывалася ў класе. Ці здараецца такое ў вас? Вымавіце словы з гукам [ў] (выдзелены ў тэксце).

Складанне сказаў па схеме.

**5. Выкананне задання 3 вучэбнага дапаможніка.**

— Разгледзьце ўважліва малюнак. Аб чым задумаўся вучань? Дапамажыце яму разабрацца, якія вучэбныя рэчы спатрэбяцца да гэтых дапаможнікаў.

**6. Гульня «Ланцужок».**

Гульня «Ланцужок» праводзіцца з мэтай замацавання назваў вучэбных рэчаў, адрознення іх ад іншых прадметаў. Яна можа мець некалькі варыянтаў. Пры арганізацыі гульні франтальна спачатку трэба разгледзець усе выявы ў кругах і зрабіць вывад, якая гэта група прадметаў (спартыўныя прылады), у квадратах (вучэбныя рэчы), у трохвугольніках (дзеянні вучняў). Потым можна паслядоўна назваць усё, што змешчана на фігурах жоўтага, зялёнага, чырвонага колераў. Калі вучні даходзяць да малюнкаў дзеянняў, трэба іх выканаць. Непасрэдна гульня можа быць арганізавана наступным чынам. Настаўнік называе лічбу, вучні робяць столькі ходаў і называюць, што паказана на адпаведным полі, ці можна назваць гэта вучэбнымі рэчамі. Калі паказана дзеянне, то выконваюць яго. Аналагічна можна арганізаваць гульню ў групах. Для гэта спатрэбяцца дадатковыя фішкі і гульнявы кубік для кожнай групы. Адлюстраванне ракеты паказвае пераход на некалькі ходаў наперад, а звілістая лінія — на некалькі ходаў назад.

**III. Вынік урока.**

— З вымаўленнем якога гука мы пазнаёміліся на ўроку? Назавіце словы з гэтым гукам. Пра каго вы слухалі тэкст? Якія беларускія словы запомнілі?

### Урок 4. Я і мая школа. Вучэбныя заняткі

**Мэта ўрока:** фарміраваць навык правільнага вымаўлення гука [ч], пазнаёміць з лексікай на тэму «Вучэбныя заняткі»; фарміраваць уменні асэнсавана ўспрымаць беларускую мову на слых (суаднасіць пачутае з малюнкавым радам, адказваць на пытанні, вызначаць у тэксце новыя словы лексічнай тэмы); фарміраваць уменні гаварэння (правільна і дакладна называць прадметы, ужываць новыя словы пры адказе на пытанні, ужываць словы тэксту пры канструяванні сказаў па схеме, пераказе па малюнках); выхоўваць культуру паводзін у школе.

**Абсталяванне:** прадметныя малюнкі: паўлін, воўк, леў, ластаўка; вучэбныя рэчы, карткі з літарамі ***Р, Б***.

**I. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў.**

**1.1. Работа па дэманстрацыйным матэрыяле.**

— Вымавіце назвы жывёл так, каб было чуваць гук [ў]: *паўлін, воўк, леў, ластаўніка*.

**1.2. Гульня «Так ці не?».**

Настаўнік паказвае вучэбныя рэчы, а называе іх ці няправільна, ці правільна. Вучні выбіраюць адказ «так» ці «не». Калі адказваюць «не», то павінны назваць правільна.

**II. Вывучэнне новай тэмы.**

**1. Фарміраванне навыкаў вымаўлення гука [ч].**

**1.1. Азнаямленне з вымаўленнем гука [ч]. Гульня «Перакладчыкі».**

Настаўнік паказвае малюнкі, вучні называюць прадметы на іх па-руску, настаўнік перакладае на беларускую мову. Вучні паўтараюць за ім.

*Чайнік, чайка, ручай, чалавек.*

— Якім гукам адрозніваецца вымаўленне слоў у рускай і беларускай мовах? Як вымаўляецца гук [ч] у беларускай мове? (Вымаўленне ізаляванага гука [ч].)

**1.2. Выкананне задання 1 вучэбнага дапаможніка.**

— Разгледзьце малюнкі. Што робіць вучань? Складзіце сказ па схеме. Што робіць вучаніца? Складзіце сказ адпаведна схеме. Выразна вымаўляйце гук [ч]. (Вызначэнне месца гука [ч] у кожным слове.) На якіх вучэбных занятках могуць адбывацца падзеі?

**1.3. Вылучэнне слоў з вывучаемым гукам.**

— Паслухайце чыстагаворку і звярніце ўвагу, які гук паўтараецца.

Чу-чу-чу — я лічылачкі лічу.
Чы-чы-чы — ты лічы, ды не крычы.

*А. Солахаў* [5]

— Вымавіце чыстагаворку. Як вымаўляецца гук [ч]? На якім уроку лічаць?

**2. Фарміраванне ўменняў аўдзіравання (заданне 4 вучэбнага дапаможніка).**

**2.1. Падрыхтоўка да слухання тэксту.**

— Разгледзьце малюнкі. Каго вы бачыце? Пра што размаўляюць мама і сын? Чым не задаволены хлопчык?

**2.2. Успрыманне твора на слых.**

***Крыўда***

Вярнуўся Косцік са школы злосным.

— Ты чаму такі? — спытала маці.

— Мне двойку паставілі. За ката.

— За якога ката?

— Вось, — раскрыў Косцік сшытак. — Хіба я дрэнна яго намаляваў?

Кот быў прыгожы. Хвост — трубой, вусы белыя, шэрсць, як у тыгра, паласатая.

— Добры кот, — сказала маці.

— А настаўніцы не спадабаўся. Двойку паставіла.

— Ты, магчыма, сваволіў на ўроку выяўленчага мастацтва?

— Не, — адказаў Косцік. — У нас сёння не было малявання. Я намаляваў яго на ўроку матэматыкі.

*В. Хомчанка* [6]

**2.3. Праверка агульнага разумення зместу тэксту.**

— Чаму Косцік вярнуўся са школы злосны? Ці правільна ацаніла настаўніца работу Косціка на ўроку? Што робяць на ўроку матэматыкі? На якім уроку малююць?

**3. Выкананне задання 2 вучэбнага дапаможніка. Хвілінка адкрыццяў.**

— Разгледзьце малюнкі ў табліцы. Адкажыце, як называецца ўрок, на якім выкарыстоўваюцца намаляваныя прадметы. Адгадайце, назва якога прадмета зашыфравана ў пустым радку. З дапамогай малюнкаў складзіце расклад урокаў у кожным радку.

**4. Фарміраванне ўменняў аўдзіравання.**

**4.1. Падрыхтоўка да слухання тэксту.**

— Куды прыйшоў хлопчык з мамай? Што купляе мама? Што робіць хлопчык?

**4.2. Успрыманне твора на слых.**

***Толікавы палачкі***

Настаўніца сказала першакласнікам, каб заўтра на ўрок матэматыкі кожны прынёс дзесяць палачак — будуць вучыцца складаць да дзесяці.

Дома Толік папрасіў маму купіць яму лічыльныя палачкі.

— А ці прадаюць іх? — спытала маці.

— Прадаюць. Я ведаю дзе. Сходзім.

І Толік прывёў маці ў кандытарскі магазін.

— Няўжо тут ёсць лічыльныя палачкі?! — здзівілася маці.

— Ёсць. Вунь цукеркі на палачках. Купі мне.

Маці ўсміхнулася і купіла Толіку дзесяць цукерак.

Дарогай Толік смактаў цукерку і думаў, што матэматыка — добрая навука. Хутчэй бы яны пачалі вучыцца лічыць да ста. Колькі б палачак тады спатрэбілася!

*В. Хомчанка* [6]

**4.3. Праверка агульнага разумення зместу тэксту.**

— Якое заданне дала настаўніца вучням? Як вырашыў выканаць яго Толік? Чаму ён хацеў, каб хутчэй пачалі вучыцца лічыць да ста? Ці згодны вы з Толікам, што матэматыка — добрая навука?

**5. Работа з дэманстрацыйным матэрыялам.**

Вучні разглядаюць малюнак «Урок музыкі». Настаўніца пытаецца:

— Якія вучэбныя заняткі паказаны на малюнку? Дакажыце. Як называецца музычны інструмент, на якім іграе настаўніца? Сумную ці вясёлую песню слухаюць і спяваюць вучні? Да чаго могуць рыхтавацца вучні? Якія песні вы любіце слухаць? А спяваць? (Пажадана прыгадаць і выканаць фрагмент знаёмай вучням песні на беларускай мове.)

**III. Вынік урока.**

— З вымаўленнем якога гука мы пазнаёміліся на ўроку? Назавіце словы з гэтым гукам.

— Пра каго вы слухалі тэкст? Якія беларускія словы запомнілі?

## Урок 5. Я і мая школа. Школьныя памяшканні

**Мэта ўрока:** фарміраваць навык правільнага вымаўлення спалучэння гукаў [шч], пазнаёміць з лексікай на тэму «Школьныя памяшканні»; фарміраваць уменні асэнсавана ўспрымаць беларускую мову на слых (прагназаваць змест тэксту па малюнках, суадносіць пачутае з малюнкавым радам, адказваць на пытанні па змесце); фарміраваць уменні гаварэння (паўтараць за настаўнікам словы і фразы; арыентуючыся на схемы, выказвацца па малюнках да твора); развіваць фанематычны слых, слыхавую памяць, уважлівасць; выхоўваць культуру паводзін у школе.

**Абсталяванне:** дэманстрацыйны матэрыял «Школьная бібліятэка», «Школьная сталовая»; малюнкі: чайнік, чайка, пчала, ключ, печ, мяч, бочка, падручнік, дошка, крэйда, ануча; карткі з літарамі ***Р***, ***Б***.

**І. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў.**

Узнаўленне навыку вымаўлення гука [ч]. На дошцы змешчаны малюнкі (чайнік, чайка, пчала,

ключ, печ, мяч, бочка, падручнік). Вучні называюць па-руску выявы на іх і адказваюць на пытанні:

— Які гук ёсць ва ўсіх гэтых словах? *(Гэта гук* [ч].*)* Як вымаўляецца ў беларускай мове адпаведны гук?

Далей работа з малюнкамі адбываецца ў наступнай паслядоўнасці:

1) настаўнік уроскід паказвае малюнкі, выкліканыя вучні вымаўляюць слова па-беларуску. Астатнія вучні класа ацэньваюць правільнасць вымаўлення. Трэба звярнуць увагу, што ў радзе слоў наўмысна змешчана слова *падручнік*. У адрозненне ад іншых слоў гэтага набору, у якіх пры вымаўленні на беларускай мове мяняецца, фактычна, толькі гукавая форма, для таго, каб назваць гэты прадмет, патрабуецца ўспомніць яго беларускі эквівалент (*учебник — падручнік*);

2) настаўнік падносіць да кожнага малюнка карткі з літарамі ***Р*** або ***Б***, вучні хорам вымаўляюць слова і даюць ацэнку правільнасці вымаўлення;

3) для таго каб размеркаваць малюнкі на тры групы: са словамі, якія называюць прадметы, з гукам [ч] у пачатку, сярэдзіне і ў канцы слова, настаўнік выклікае да дошкі трох вучняў або праводзіць работу франтальна. Праверка задання выконваецца калектыўна.

**II. Вывучэнне новай тэмы.**

**1. Фарміраванне навыку вымаўлення спалучэння гукаў [шч] (заданне 1 вучэбнага дапаможніка).**

Называнне вучнямі прадметаў на малюнках парусску, пераклад настаўнікам на беларускую мову, вымаўленне вучнямі па-беларуску, вызначэнне месца спалучэння гукаў [шч] у кожным слове, суаднясенне яго з патрэбнай схемай. Пошук «пасткі» — вызначэнне лішняга слова (без спалучэння [шч]). Пасля выканання задання трэба назваць словы са спалучэннем [шч] у пачатку слова, у канцы слова.

**2. Азнаямленне з лексічнай тэмай «Школьныя памяшканні».**

**2.1. Выкананне задання 2 вучэбнага дапаможніка.**

Уступная гутарка, у якой настаўнік паведамляе пра завочную экскурсію па школьных памяшканнях і звяртае ўвагу вучняў на малюнкі ў вучэбным дапаможніку. Вучні называюць школьныя памяшканні, якія пазналі, на рускай мове, а настаўнік перакладае на беларускую. Далей гутарка арганізуецца па кожным малюнку:

— Разгледзьце першы малюнак. Хто гэта? Што ён трымае ў руках? Як называецца памяшканне, дзе збіраюцца настаўнікі, захоўваюцца класныя журналы? Каго бачым на другім малюнку? Як называецца чалавек, які выдае кнігі? Дзе вучні бяруць кнігі і падручнікі? Якое школьнае памяшканне бачым на трэцім малюнку? Для чаго яно? Хто там працуе? Разгледзьце чацвёрты малюнак. Які ўрок праходзіць у гэтым памяшканні? Па чым вы здагадаліся? Як называецца гэтае памяшканне?

Пасля гутаркі настаўнік прапануе разгледзець малюнкі вучняў і запытваецца, што можна пра іх сказаць па іх знешнім выглядзе. Пасля таго як вучні выкажуць свае меркаванні, настаўнік прапануе вучням у парах падумаць, у якое памяшканне ідзе кожны вучань? Пасля абмеркавання ў парах вучні выказваюць свае меркаванні і тлумачаць, чаму яны так думаюць.

**2.2. Работа з дэманстрацыйным матэрыялам.**

Вучні дзеляцца на дзве групы і атрымліваюць «па сакрэце» малюнкі «Школьная бібліятэка», «Школьная сталовая». Вучні кожнай групы павінны расказаць па малюнку так, каб вучні другой групы здагадаліся, пра якое школьнае памяшканне ідзе размова, і наадварот. Трэба звярнуць увагу ў гутарцы на правілы паводзін у гэтых школьных памяшканнях.

**3. Фарміраванне ўменняў аўдзіравання (заданне 4 вучэбнага дапаможніка).**

**3.1. Падрыхтоўка да слухання тэксту.**

Настаўнік прапануе адгадаць загадку.

Электрычны, мілагучны,
Ён усім знаёмы вучням.
Звонка кліча на ўрок,
Заліваецца ... (*званок*).

*Ю. Свірка* [5]

Настаўнік пытаецца ў вучняў:

— Куды кліча званок вучняў? Што робяць вучні на перапынку?

Далей праводзіцца разглядванне малюнкавага раду і прагназаванне зместу па кожным малюнку. Асаблівую ўвагу трэба надаць таму, што вучні бачаць у вынасках.

<u>Слоўнікавая работа.</u> Настаўнік па малюнках на дошцы (язь, штурвал, будынак з цэглы з надпісам «Клуб», кошык суніц) тлумачыць значэнні слоў «язь», «штурвал», «клуб», «кошык суніцы».

Пастаноўка мэтавага пытання:

— Паслухайце верш і скажыце, чаму гэты перапынак назвалі вясёлым.

**3.2. Успрыманне твора на слых.**

Слуханне апавядання, суаднясенне зместу з малюнкавым радам. Актуалізацыя ў час слухання пасля кожнага фрагмента верша.

***Вясёлы перапынак***

У калідоры смех і рогат,
Хлопцы збіліся гурбой,
Выхваляюцца, як могуць,
Між сабой наперабой.

*(Як паводзілі сябе вучні ў калідоры?)*

«Я злавіў язя такога,
Што пагрыз усю вуду
І хвастом мяне самога
Ледзь не скінуў у ваду...

*(Каго злавіў хлопчык? Ці мог ён быць такога памеру?)*

Бухаў вецер ураганам,
Грукатаў дзявяты вал.
Знесла хваляй капітана,
Ну а я трымаў штурвал...»

*(Што трымаў хлопчык? Ці магло такое быць?)*

«Гэта што! — сказаў Якуб. —
Змураваў я з цэглы клуб,
Ды вялізарны такі,
Што яму стаяць вякі!»

*(Што збудаваў Якуб? Ці мог ён сам гэта зрабіць?)*

Да хлапцоў падбегла Света:
«Што зрабіла я за лета?
Памяркуйце, хіба мала?
З'ела поўны кошык я
Тых суніц, што назбірала
Цёця добрая мая».

*(Колькі суніц з'ела дзяўчынка? Ці бывае такое на самай справе?)*

Выдумляе кожны складна,
Ручайком цячэ расказ.
Ды звініць званок і ўладна
Кліча ўсіх дзяцей у клас.

*П. Макаль* [7]

**3.3. Праверка агульнага разумення зместу тэксту.**

Гутарка па пытаннях:

— Пра што расказалі вучні на перапынку? Ці можа гэта быць праўдай? Чаму перапынак атрымаўся вясёлы? Што вы рабілі летам?

**3.4. Выкананне заданняў на падставе праслуханага твора.**

Выказванні вучняў па кожным малюнку да твора. Разгляд схем сказаў. Складанне сказаў па схемах, «прачытванне» іх:

1. Звініць званок.
2. Вучні выбеглі ў калідор.
3. Каго злавіў хлопчык?
4. Што трымаў хлопчык?
5. Што збудаваў Якуб?
6. Колькі суніц з'ела Света?
7. Званок кліча дзяцей у клас.

**III. Вынік урока.**

— З якім гукам вы пазнаёміліся на ўроку? Назавіце словы з гукам [дж]. Пра якія школьныя памяшканні гаварылі на ўроку?

## Я і мая школа. Паўтарэнне

**Заданне 1.**

Заданне мае на мэце арганізацыю маўленчай дзейнасці вучняў па малюнках, паўтарэнне лексікі на тэму «Я і мая школа», практыкаванне ў яе дарэчным ужыванні. Па першым малюнку неабходна вызначыць, дзе адбываецца дзеянне, назваць персанажа, патлумачыць, чым ён займаецца, назваць вучэбныя рэчы. Важна звярнуць увагу, што рукзак на стол ставіць не трэба, лепш паставіць яго на стул. Выказванне па малюнку можна зрабіць ад першай асобы («Я збіраю рукзак у школу...») або апісальна («Хлопчык збірае рукзак у школу...»).

Другі малюнак таксама разглядаецца з мэтай вызначэння, дзе і калі адбываюцца падзеі, хто на ім прысутнічае, з якой нагоды вучань уручае кветкі. Важным з'яўляецца паказаць вучням прыклад віншавання з Днём ведаў і словы ўдзячнасці. Гэта віншаванне і адказ на яго можна паўтарыць, разыграўшы ў парах.

**Заданне 2.**

Матэрыял задання дае магчымасць паўтарыць лексіку тэм «Вучэбныя рэчы» і «Школьныя памяшканні». Спачатку вучні вызначаюць колькасць груп малюнкаў і называюць прадметы (памяшканні) кожнай групы, ацэньваюць правільнасць ужывання лексікі. Далей настаўнік прапануе загадкі па кожнай групе малюнкаў.

Тонкі ён, драўляны,
Ярка фарбаваны.
І заўжды, паверце,
Піша толькі сэрцам. *(Аловак.)*

*М. Пазнякоў* [8]

Хто са мною пасябруе,
Той ужо не засумуе.
Языка хоць і не маю,
А пра ўсё апавядаю. *(Кніга.)*

*М. Пазнякоў* [8]

Кніжкамі набітыя,
На замкі закрытыя,
Паселі на плечы
Школьнай малечы. *(Рукзакі.)*

*У. Мацвеенка* [9]

Я ніколі не сумую —
Моцна з кнігамі сябрую.
Дзень надарыцца няўдачны —
Не бядую і не плачу,
Супакой мой не ў аптэцы,
А ў маёй ... (*бібліятэцы*).

*М. Пазнякоў* [8]

Пасля выканання задання настаўнік прапануе паслухаць загадку і адгадаць яе.

Ля сцяны стаіць Чарнушка,
Па ёй бегае Бялушка,
За Бялушкаю Макрушка.
Шмаргане туды-сюды —
Змые белыя сляды.
*(Дошка, крэйда, анучка.)*

*У. Мацвеенка* [10]

Для таго каб палегчыць выкананне задання, настаўнік паведамляе, што гэтыя прадметы ёсць у кожным класе. Можна павесіць на дошку малюнкі дошкі, крэйды, анучкі з набору дэманстрацыйнага матэрыялу і назваць адгадкі. Калі вучні не здагадаліся, настаўнік сам паказвае дошку, анучку, крэйду і называе іх па-беларуску. Потым пытаецца: «Якія падказкі прагучалі ў вершы?», паказвае прадметы і просіць вучняў назваць іх хорам. Запытваецца: «У якім школьным памяшканні заўсёды павінны быць гэтыя прадметы?»

**Заданне 3.**

Заданне мае на мэце ўзнавіць у памяці вучняў герояў праслуханых твораў і падзеі, звязаныя з імі. Вучні прасочваюць па лініях злучаныя малюнкі і тлумачаць іх узаемасувязь, называюць герояў твораў, узнаўляюць падзеі, якія адбываліся. Называць праслуханыя творы не патрабуецца. Варта прыгадаць, з якой тэмай звязаны гэтыя малюнкі, прыгадаць адпаведную лексіку.

*Працяг будзе.*